Нялюбая сястра Беларусі

Ян Максімюк



Згадка трыццацігадовай даўнасьці

Гэта было, мабыць, у траўні або чэрвені 1982 году. У Польшчы трывала ваеннае становішча. Запомнілася, што дзень быў вельмі пагодлівы і цёплы. Я, студэнт чацьвёртага курсу фізыкі Варшаўскага ўнівэрсытэту, выбраўся ў адведзіны да землякоў з Падляшша, Уладзіміра Паўлючука і Ірэны Баравік. Яны здымалі кватэру ў квартале Урсынаў у Варшаве — разьлеглым і даволі далёкім ад цэнтру скупішчы шэрых і панылых панэльных блёкаў. У адным з такіх урсынаўскіх блёкаў, непадалёк ад таго, дзе жылі Паўлючук і Баравік, амаль год давялося пажыць і мне з жонкай, калі пасьля шлюбу на Беласточчыне мы вярнуліся ў Варшаву на ўнівэрсытэцкія заняткі ў кастрычніку 1983 ды зьнялі там пакой з кухняй.

Уладзімір Паўлючук у 1972 апублікаваў кніжку „Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej”, у якой аналізаваў этнічную і нацыянальную сьвядомасьць праваслаўнага насельніцтва Беласточчыны. Да свайго сораму, я не прачытаў гэтай кніжкі ні ў 1970-х, калі яна ўсё яшчэ выклікала жывую зацікаўленасьць у некаторых акадэмічных асяродзьдзях Польшчы, ні пазьней. І, як здаецца, няма істотных шанцаў, што я прачытаю яе калі-небудзь у будучыні. Бо з таго вобразу сацыялягічнай канцэпцыі Ўладзіміра Паўлючука, які я здолеў сабраць з пазьнейшых ягоных артыкулаў і інтэрвію, вынікала, што ягоная кніжка пра сьветапогляд нашых землякоў стала неактуальнай ужо ў 1982, калі мы зь ім сустрэліся ўпершыню.

Агульна кажучы, Паўлючук апісаў „беларусізацыю” праваслаўнага насельніцтва Падляшша ў камуністычнай Польшчы як працэс павярхоўны і малаістотны, які не закрануў глыбіннай асновы мысьленьня большасьці падляшукоў. Кажучы наўпрост, беларуская сьвядомасьць, якая нарадзілася на Падляшшы пасьля 1956, калі камуністычныя ўлады стварылі Беларускае грамадзка-культурнае таварыства і ўвялі абавязковае навучаньне беларускай мовы ў школах на праваслаўнай Беласточчыне — гэта, паводле Паўлючука, перш за ўсё „сьвядомасьць назвы”, а не сьвядомасьць прыналежнасьці да беларускай нацыі як нечага большага, чым толькі наша „праваслаўнасьць” і „рускасьць”. Ніхто з падляшукоў ня стаў пратэставаць, калі камуністычная ўлада пасьля Другой сусьветнай вайны гуртам залічыла іх да беларусаў, але ў глыбіні душы яны засталіся такімі ж „праваслаўнымі” і „рускімі”, якімі былі і раней. І менавіта такі нацыянальна нявысьпелены — „этнаграфічны” — матэрыял, паводле прагнозу Паўлючука, меўся спакваля распусьціцца ў польскай культуры і мове.

Тэзіс Паўлючука аб беспэрспэктыўнасьці будаваньня беларускай нацыянальнай тоеснасьці на Падляшшы падладзіўся як ня трэба лепш пад палітычную музыку пачатку 1970-х у Польшчы, калі пад кіраўніцтвам сьвежапрызначанага правадыра, Эдварда Герэка, Польская аб’яднаная рабочая партыя з запалам узялася за чарговую індустрыяльную мадэрнізацыю краіны і будаваньне „ідэалягічнай еднасьці нацыі”. Адказным таварышам у Варшаве стала зразумела, што беларуская меншасьць на Беласточчыне будзе адно запрудай у паходзе гэтага заўсёды адсталага рэгіёну да сацыялізму і нацыянальнай еднасьці. А таму, абмяняўшы вярхушку ў ваяводзкім камітэце партыі ў Беластоку і павыкідаўшы адтуль „беларусаў” (то бок, „праваслаўных” і „рускіх”, паводле тэрміналёгіі Паўлючука), яны пачалі зачышчаць і самую інстытуцыянальную беларускасьць.

Адным з самых моцных удараў па нефальклёрнай беларускасьці, якая пасьпела пусьціць сякія-такія карані цягам папярэдняга паўтара дзясятка гадоў, быў перавод беларускай мовы ў школах на Беласточчыне са статусу абавязковага прадмету на неабавязковы. Беларуская мова стала неабавязковай у 1972 — тым самым, калі выйшла згаданая кніжка Паўлючука. Я тады канчаў сёмую клясу. Помніцца, што пад канец сёмай клясы нам упершыню трэба было дэкляраваць, ці ў наступным годзе мы хочам вывучаць беларускую мову, ці не. Нас у сёмай клясе школы ў Гародчыне (у якую хадзілі дзеці зь яшчэ дзьвюх іншых вёсак, Ляхоў і Козьлікаў) было адзінаццаць душ, але толькі адна наша аднаклясьніца не схацела беларускай мовы, тым часам як усе астатнія давучылі яе да канца васьмігодкі і потым разбрыліся хто куды, гэта значыць, пераважна ў прафвучэльні ў Гайнаўцы, Бельску і Беластоку.

У 1960-х колькасьць школьнікаў на Беласточчыне, якія хадзілі на абавязковыя заняткі беларускай мовы, набліжалася да 12 тысяч. Пад канец 1970-х гэты лік скараціўся напалову. А пад канец 1980-х гэты лік затрымаўся на наступныя два дзесяцігодзьдзі недзе пад адзнакай 3,5 тысячы. Па сутнасьці, школьная статыстыка стабілізавалася ўсяго дзякуючы тром школам — ліцэю № 10 у Гайнаўцы, ліцэю № 2 у ды школе № 3 у Бельску. Гэта традыцыйна „беларускія” школы, дзе беларуская мова, нягледзячы на свой фармальна неабавязковы статус, на практыцы зьяўляецца абавязковым прадметам.

Ускладаць усю віну за заняпад навучаньня беларускай мовы на Беласточчыне выключна на дзяржаву не выпадае. Усё ж перавод урокаў беларускай мовы на неабавязковы статус — гэта ня іх забарона. Схацелі б беларусы вывучаць беларускую мову — дык вывучалі б. Але, па-першае, большасьць зь іх не схацела. І тут Уладзімір Паўлючук меў несумненную рацыю — беларуская сьвядомасьць на Беласточчыне, калі глядзець на адносіны беларусаў да беларускай мовы, была і застаецца даволі павярхоўнай. Па-другое, цягам 1970-х і 1980-х

праваслаўныя падляскія вёскі пацярпелі дэмаграфічную катастрофу, у выніку якой у іх амаль не засталося маладых і пэрспэктыўных гаспадароў. Моладзь перабралася ў гарады, а там ня ўсюды можна было навучацца беларускай мове. Вось у Беластоку навучаньне беларускай мовы адкрылася толькі ў сярэдзіне 1990-х. Па-трэцяе, веданьне беларускай мовы на Беласточчыне па-за школьнымі ўрокамі наогул нікому не было патрэбнае ў жыцьці. Большасьць школаў зь беларускай мовай знаходзілася і далей знаходзіцца на падляскай моўнай тэрыторыі, то бок, на заходняй пэрыфэрыі арэалу палескіх гаворак, якія па сваіх фанэтычна-марфалягічных парамэтрах бліжэйшыя да ўкраінскай літаратурнай мовы, чым да беларускай. Дома пераважная большасьць навучэнцаў літаратурнай беларускай мовы гаварыла і гаворыць з бацькамі і дзядамі „па-свойму”, то бок, па-падляску, а не па-беларуску. Па-чацьвёртае, як 30 і 40 гадоў таму, так і цяпер, Беласточчыну ад Беларусі аддзяляе цывілізацыйная і палітычная сьцяна, якая эфэктыўна запыняе ўсялякія істотныя спробы культурнай ці моўнай дыфузіі. З усходняга боку, ад „масіву нацыі”, ідуць на Беласточчыну хутчэй за ўсё адмоўныя пасылы, што тычыцца ўтрымліваньня беларускай ідэнтычнасьці. Беларускасьць на Падляшшы — гэта „Беларусь сама для сябе”, канструкцыя цывілізацыйна, сьветапоглядна і моўна моцна адрозная ад Рэспублікі Беларусь.

Дык чаму я кажу, што кніжка Уладзіміра Паўлючука, якая дала яму тытул кандыдата сацыялёгіі, было неактуальнай ужо ў 1982? У чым ён памыліўся?

Памыляўся ён менавіта ў сваім прароцтве, што гэтая „этнаграфічная беларускасьць”, задэкрэтаваная камуністычнай уладай на хвалі пасьлясталінскай адлігі ў 1956, была загадзя асуджаная на паразу, гэта значыць, што зь яе не магла нарадзіцца ніякая нацыянальная беларуская ідэнтычнасьць *sensu stricto*, бо яе, гэтую „этнаграфічную беларускасьць”, мела непазьбежна рассмактаць і засмактаць палянізацыя.

У 1981 „этнаграфічна беларускія” студэнты з вышэйшых навучальных установаў у Варшаве і Беластоку (крыху пазьней далучыліся акадэмічныя асяродкі ў Любліне і Ольштыне) заснавалі Беларускае аб’яднаньне студэнтаў (БАС) — першую ў камуністычнай Польшчы беларускую арганізацыю, якая не была інсьпіраваная ўладай і не кантралявалася ёю (хоць, як ніхто не сумняваўся, БАС усё ж быў інфільтраваны Службай бясьпекі празь студэнтаў-стукачоў). БАС узьнік у апазыцыі да афіцыйнай арганізацыі беларусаў у Польшчы, Беларускага грамадзка-культурнага таварыства (БГКТ), якая маладым пакаленьням падляскіх беларусаў бачылася як структура фасадная, адсталая ад сучаснасьці і моцна скампрамэтаваная падхалімскім слугаваньнем камуністычнай уладзе. Кажучы патасна, у 1981 пачаліся роды „неэтнаграфічнай” беларускай нацыянальнай тоеснасьці ў Польшчы, хоць асновы гэтай новай тоеснасьці былі тады яшчэ даволі расплывістыя і ня ўсім зацікаўленым уцямныя. Прагноз Уладзіміра Паўлючука адносна немагчымасьці пабудовы „мадэрнай” беларускай нацыянальнай тоеснасьці на Беласточчыне ужо тады пачаў рассыпацца.

Я ня ўпэўнены, ці гаварылі мы з доктарам Паўлючуком пра гэты ягоны няспраўджаны прагноз вясною 1982, калі спаткаліся ў Варшаве. Хутчэй за ўсё — не, бо я ж не прачытаў ягонай кніжкі. Але, зразумела, мы гаварылі пра пэрспэктывы беларускага студэнцкага руху, які пасьля ўвядзеньня ваеннага становішча аказаўся ў „замарожаным” стане. І пра пэрспэктывы БГКТ — арганізацыі, якую ён добра ведаў, і то зблізку, бо перад тым, як заняцца сацыялёгіяй і антрапалёгіяй, Уладзімір Паўлючук пару гадоў адпрацаваў журналістам у „Ніве”.

Спадар Паўлючук вельмі пэсымістычна ацэньваў інтэлектуальны патэнцыял беларускага

руху на Беласточчыне, як, дарэчы, і інтэлектуальны стан Беласточчыны наогул. У 1980 ён наогул пакінуў правінцыйны Беласток і перабраўся ў Варшаву, а ў 1983 годзе перанёсься яшчэ далей ад Беласточчыны — на Ягелёнскі ўнівэрсытэт у Кракаве. У Беласток прафэсар Уладзімір Паўлючук вярнуўся ў другой палове 1990-х, ужо як адзін з найбольш вядомых у краіне сацыёлягаў, этнолягаў і рэлігіязнаўцаў.

Размаўлялі мы са спадаром Паўлючуком „па-свойму”, калі ўжыць тут сацыялягічную ці „этнаграфічную” тэрміналёгію мінулага стагодзьдзя, або па-падляску, калі ўжыць тут больш дакладную (*sensu stricto*) тэрміналёгію цяперашняга стагодзьдзя. Уладзімір Паўлючук нарадзіўся ў 1934 у вёсцы Рыбалы ў Заблудаўскай гміне, блізка паўночнай мяжы тых падляскіх гаворак, якія я ўзяў як базавы арэал для кадыфікацыі правапісу падляскай мовы. Інакш кажучы, ягоная родная мова — гэта чысьцюсенькая *Standard Podlachian*.

А вось у мове Ірэны Баравік, якая нарадзілася ў 1956 у вёсцы Мора ў Чыжоўскай гміне, сям-там чуваць „ыканьне”, якое засталося па-за падляскай правапіснай нормай.

Ірэна Баравік — сёньня прафэсар Ягелёнскага ўнівэрсытэту і вядомы ў Польшчы рэлігіязнаўца — у 1979, калі была студэнткай філіялу Варшаўскага ўнівэрсытэту ў Беластоку, выдала пад шыльдай БГКТ зборнік вершаў па-беларуску, які называўся „Супраць ветру”. Як мне цяпер думаецца, мы зь ёю пазнаёміліся на нечым накшталт аўтарскай сустрэчы ў 1982 у клюбе БГКТ у Варшаве на вуліцы Сэнатарскай 8, які тады служыў месцам сходак як для дзеячоў БГКТ, так і студэнтаў БАС-у. Акрамя беларускіх вершаў, на той сустрэчы яна прачытала і кавалак паэмы „Čas, kotory vmiraje”, якую яна напісала на сваёй роднай мове, то бок, на гаворцы вёскі Мора. Паэма публікавалася ў „Ніве” ў 1981, на старонцы Беларускага літаратурнага аб’яднаньня „Белавежа” (першая частка паэмы ў ліпені, другая ў лістападзе). Паэма зрабіла на мяне ашаламляльнае ўражаньне. Гэта быў ці ня першы выпадак, калі я ўбачыў тэкст, надрукаваны *на маёй роднай мове*. І гэта быў тэкст неблагога літаратурнага ўзроўню. Я ўбачыў сваю хатнюю мову з зусім нечаканай пэрспэктывы — на ёй, як выявілася, было магчыма пісаць і літаратуру. Крыху пагаварыўшы пра паэзію ў клюбе БГКТ пры нагодзе той аўтарскай сустрэчы, мы, відаць, дамовіліся са спадарыняй Баравік працягнуць гутарку ў яе на кватэры. Я прыйшоў на тую сустрэчу з уласным перакладам кавалка паэмы „Čas, kotory vmiraje” на ангельскую мову, чым вельмі пацешыў і паэтку, і доктара Паўлючука...

... Тая размова вясною 1982 на варшаўскім Урсынаве сёньня бачыцца мне як пункт, у якім упершыню зьбегліся ў адно тры або й чатыры тэмы, якія ў пазьнейшым маім жыцьці пачалі ствараць яго эсэнцыю: ангельская мова, пераклад, падляская мова, беларуская нацыянальная ідэнтычнасьць.

Летуценьнік з Корніцы

Мікола Янчук (1859-1921) пражыў насычанае жыцьцё.

Ён нарадзіўся ў сялянскай сям’і ў вёсцы Корніца (па-мясцоваму: *Kórnicia*), якая тады належала да Канстанцінаўскага павету Седлецкай губэрні. Сёньня вёска мае назву *Stara Kornica* і зьяўляецца цэнтрам гміны ў Лосіцкім павеце Мазавецкага ваяводзтва, якое ў гэтым месцы ўкліньваецца паміж Падляскім і Люблінскім ваяводзтвамі, даходзячы амаль да мяжы зь Беларусьсю. Вёска знаходзіцца за дваццаць кілямэтраў на поўдзень ад Бугу, які ўтварае натуральную мяжу паміж Паўночным і Паўднёвым Падляшшам, а таксама паміж Падляшшам ды Валыньню і часткова Палесьсем.

У 1884 або 1885 Янчук закончыў гістарычна-філялягічны факультэт Маскоўскага ўнівэрсытэту. Спачатку працаваў настаўнікам, потым быў памочнікам бібліятэкара Румянцаўскага музэю і захавальнікам Дашкоўскага этнаграфічнага музэю ў Маскве. Удзельнічаў у шматлікіх этнаграфічных экспэдыцыях, як у сваё роднае Падляшша, так і ў Беларусь, падчас якіх рупліва займаўся зборам фальклёрнага матэрыялу, асабліва народных песьняў. У сувязі са сваімі этнаграфічна-фальклёрнымі і літаратурнымі зацікаўленьнямі належаў да шэрагу арганізацый: Таварыства драматычных пісьменьнікаў і кампазытараў, Этнаграфічнага таварыства, Маскоўскага археалягічнага таварыства, Маскоўскага таварыства гісторыі і расейскіх старажытнасьцяў, Таварыства аматараў рускай славеснасьці. З 1898 быў сакратаром аддзелу этнаграфіі Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалёгіі і этнаграфіі пры Маскоўскім унівэрсытэце, пры якім у 1901 заснаваў музычна-этнаграфічную камісію і кіраваў ёю да 1920. У 1889 стаў адным з заснавальнікаў часопісу „Этнографическое обозрение” і быў яго рэдактарам да 1906. Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі стаў выкладчыкам у Маскоўскім унівэрсытэце, дзе чытаў курс лекцый па беларускай і ўкраінскай літаратурах. Удзельнічаў у працах камісіі па заснаваньні Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, а пасьля яго адкрыцьця ў 1921 атрымаў пасаду прафэсара катэдры беларускай літаратуры і этнаграфіі.

Акрамя вялікай колькасьці навуковых працаў, сярод якіх асабліва выдзяляюцца „Маларускае вясельле ў Корніцкім прыходзе Канстанцінаўскага павету Седлецкай губэрні” (1886) і „Па Менскай губэрні” (1889), Янчук апублікаваў яшчэ з паўтузіна п’есаў з народнага жыцьця. „Энцыкляпэдыя этнаграфіі Беларусі” (Мінск, 1989) падае, што Янчук „літаратурныя творы пісаў на рускай мове і палескай гаворцы”. Украінскамоўная Вікіпэдыя піша, што ў сваіх п’есах Янчук „прытрымліваўся агульнаўкраінскай моўна-літаратурнай нормы таго часу, захоўваючы асаблівасьці падляскіх гаворак”.

Мне ня трапіўся ў рукі тэкст ніводнай зь Янчуковых п’есаў, а таму я не магу сказаць, да якой ступені ён здолеў захаваць „асаблівасьці падляскіх гаворак”. Ці захаваў нашы тры дыфтонгі, напрыклад? Або зацьвярдзелыя зычныя *ж, ш, ч, дж, р*?

Але вось у тых вершах Янчука, якія дайшлі да нашага часу, ён ня тое што захаваў згаданыя асаблівасьці, але папросту напісаў іх жыўцом на сваёй корніцкай гаворцы, гэткім чынам стаючыся пачынальнікам літаратуры на падляскай мове. Давайце працытуем ягоны загадкавы літаратурны тэкст, які датуецца 1918 годам і называецца „Jankovi Kupali (na pametku)”:

Ja ne bačyv tebe, bracie,
Nikdy v życiu j v oko,
Ale dušu tvoju baču
I ciniu vysoko.

Z tvojim viêršom pred očyma
Ja ne raz opłakav
Svoho kraju biêdnu dolu
J ziomkuv — neborakuv.

Bo j moja ojčyzna, bracie,
Jak ne rôdna v Boha,
Tež terpiêła zavše muki
I była uboha.

A teper, jak voroh jeji,
Nivečyt, kaliêčyt,
Vže j sam Boh jôj tyje rany
Bodaj čy zaliêčyt.

A Pudlasie i Ruś Biêła,
Jak dviê sestry rôdny.
Mov odnoho członki tiêła,
Byli b zavše zhôdny.

Ale dola jich lichaja
Zdavna rozłučyła
I obom tiažki na šyju
Kameń nałožyła.

I stohnali vony, j stohnut,
I budut stohnati,
Bo to mačocha jich dola,
A ne rôdna mati.

To ž z nas kožny, chto včuvaje
Cienžar toho losu,
Jak brat brata nech ratuje
Od tiažkoho ciosu.

A choč mniê b iti nehože
V rômniaščki z toboju,
Ja vitaju tebe, ziomku,
Braćkoju rukoju.

Tvojiê dumy, tvojiê slozy
Narud tvôj ociênit
I potômok tvoje jmenie
Vnukovi namiênit.

A od mene mojim vnukam
Nic sia ne zostane
I moja nikčemna sława
Tak jak sniêh rozstane.

Nech rozstane, aby soncie
Było tepłe j jasne.
Ščo b jim liêpša była dola,
Życie sviêtłe j krasne!

Калі прыплюшчыць вочы на два ўкраінізмы (*mov, namiênit*) і жменьку палянізмаў (*ziomkuv, zavše, członki, cienžar, ciosu*) — гэтыя палянізмы, дарэчы, трапляюцца і ў падляскіх гаворках на Беласточчыне — дык можна сказаць, што верш напісаны беззаганна на *стандартнай падляскай мове*, якую амаль стагодзьдзе пазьней пачаў папулярызаваць вэбсайт Svoja.org. Неверагодна!

А яшчэ больш неверагодна, што Янчук ставіць Падляшша ўпоравень зь Белай Русьсю, а не з Малой Русьсю ці Ўкраінай — *jak dviê sestry rôdny*! Хто ж на той час мог лепш ведаць, як ня ён, што корніцкая гаворка значна бліжэйшая да маларускага стандарту, чым да беларускага? Ды ўсё ж не Ўкраіна родная сястра Падляшшу, а Беларусь!

Або падумайце пра гэтае двухрадкоўе: *Ale dola jich lichaja / Zdavna rozłučyła*. Калі, да халеры, гэтая доля разлучыла Падляшша зь Беларусьсю? І што значыць *zdavna*? Падумайце яшчэ раз, і адказ, хоць і нечаканы, зьявіцца непазьбежна: у 1569 годзе, калі Падляшша адышло ад Вялікага княства да Кароны! Вось тады нас доля разлучыла і, кажучы па праўдзе, ўжо ніколі потым не злучыла. У 1939-1941, калі Падляшша апынулася ў межах БССР, да нас вярнулася не ліхая доля, каб выправіць сваю гістарычную памылку, а прыйшоў на яве кашмар зь пекла родам...

Ну і хто з нашых падляскіх украінцаў цяпер мне скажа, што Падляшша, так бы мовіць, спакон веку прагнула далучыцца да свае матухны Ўкраіны? Вось з вуснаў самага выдатнага сына падляскага народу мы пачулі, што Падляшша якраз прагнула быць зь Беларусяй, *jak dviê sestry rôdny*.

Зразумела, што Янчук як чалавек памяркоўны і ўсебакова абазнаны з духоўным абліччам свайго народу і ня думаў пра нейкі палітычны сэпаратызм падляшукоў ці падляскае нацыятварэньне. Але ён меў сьвядомасьць асобнасьці гістарычных досьведаў нашага мужыцкага Падляшша і казацкай Украіны, як і сьвядомасьць адрознасьці падляскай гаворкі ад агульнаўкраінскага стандарту, які ў 1918 ужо амаль поўнасьцю аформіўся ў пісьмовай традыцыі. Паводле тыпу народнай культуры і сьветапогляду падляшукі для Янчука былі несумненна бліжэйшымі да беларусаў, чым да ўкраінцаў. Вось якраз таму Купала быў для Янчука і *земляком*, і *братам*. А што тычыцца падляскай мовы, дык Янчук летуцеў зрабіць для яе хоць часткова тое, што Купала зрабіў для беларускай. Прачытайце яшчэ адзін ягоны верш:

Ja by chtiêv, — o daj to Bože,
Ščo b pora nastała,
Ščo b jakaja duša dobra
Koliś zaspivała.

Tuju piêsniu, ščo składajem
V svojôj rôdnuj movi,
Ščo najbôlš za vse była mniê
Zavše do lubovi.

Jeji narud môj začuvšy
Može strepenetsia
Didôv, pradiduv zhanuvšy
Može j sam pročknetsia.

Može verne svoju movu,
Strôj i zvyčaj vłasny,
I moja błahaja piêsnia
Miży jim ne zhasne.

Як тут не згадаць Купалавы радкі: *Шчасьце так рэдка над сьветам усходзе; / Усё ж досыць бывае меці хоць мала, / Долю каб бачыў у родным народзе, / А быў бы шчасьлівы*

Янка Купала.

На жаль, падляшукі з ваколіцаў Міколы Янчука ўжо пры ягоным жыцьці масава адмовіліся ад уласнай культуры і мовы ды спалянізаваліся. У іх гісторыя склалася па-іншаму, чым у нас, на Паўночным Падляшшы. Таму і чуваць у вершы Янчука выразная нота пэсымізму і сумневу адносна таго, ці ягоны народ *strepenetsia.*

На Паўночным Падляшшы царкоўную унію ліквідавалі ў 1839, і ніхто яе асабліва не шкадаваў. Яна, тая унія, ня здолела нейкім істотным чынам укараніцца ў народнай сьвядомасьці і душы, каб выклікаць хоць неяк заўважны супраціў падляшукоў супраць пераходу ў праваслаўе. Наш мужыцкі народ пайшоў *безропотно* ў расейскае праваслаўе і як спаў непрабудным сном да 1839, так і праспаў яшчэ стагодзьдзе пасьля таго. Ніхто яго не чапаў, і ў сваёй „праваслаўнасьці" і „рускасьці", закансэрваванай Расейскай праваслаўнай царквою, а потым Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквою, ён датрываў ажно да часоў камуністычнай Польшчы, калі яго прабудзілі да эпахальнай пабудовы сацыялізму пад шыльдай беларусаў. Уладзімір Паўлючук мае рацыю, кажучы, што спачатку гэта была ўсяго шыльда, а не нацыянальная сьвядомасьць. Але гэтая беларуская шыльда ня муляла. І з часам, калі народ стаў больш граматны, яна стала ўспрымацца як нешта большае, чым толькі фармальны назоў, начэплены чужынцамі. Гісторыя ў гэтым выпадку зрабіла камуністам непрыемны жарт — калі яны надумаліся згарнуць беларускі рух і зноў упіхнуць яго у агульны кацёл разам з палякамі, маё пакаленьне ў пачатку 1980-х ня тое што не далося туды ўпіхнуць, але і камунізму будаваць ужо не схацела.

З падляшукамі з Паўднёвага Падляшша гісторыя абышлася надзвычай жорстка. Уніяцтва на Паўднёвым Падляшшы трывала да 1875. Яно сярод падляшукоў Холмскай уніяцкай япархіі запусьціла настолькі глыбокія карані, што яны ня тое што не хацелі пераходзіць у праваслаўе добраахвотна, калі пасьля паўстаньня 1863-1864 царскія ўлады пастанавілі ачысьціць Паўднёвае Падляшша ад лацінска-польскага ўплыву, але шмат хто зь іх яўна супраціўляўся гэтаму пераходу. Па некаторых мусілі страляць царскія казакі. Царскім уладам удалося фармальна вярнуць праваслаўю чвэрць мільёна уніяцкіх душ, але вялікая частка зь іх перайшла ў каталіцтва ў пачатку XX стагодзьдзя, калі цар дазволіў былым падляскім уніятам такі выбар. Парадаксальна, падляшукі, якіх цар маніў у праваслаўе тым, што пакідаў у храмах іхную мову ды па сутнасьці амаль ня зьменены ўніяцкі літургічны рытуал, выбралі каталіцтва і польскую мову, то бок, поўны разрыў са сваёй культурна-рэлігійнай традыцыяй. Тыя з падляшукоў, якія ўсё ж засталіся пры праваслаўі, адчулі на сабе поўны цяжар помсты палякаў у пэрыяд міжваеннай Польшчы, калі польскі ўрад пастанавіў выкурыць „рускі дух" з тэрыторыі на захад ад Бугу і сілай пераводзіў праваслаўных у каталіцтва (не ва ўніяцтва) ды разьбіраў і руйнаваў праваслаўныя (раней уніяцкія) храмы як непатрэбныя або перадаваў іх у карыстаньне католікам. Да выбуху Другой сусьветнай вайны карэнная культура і мова падляшукоў на Паўднёвым Падляшшы была ўжо ў стадыі агоніі. Камуністы падчас акцыі „Вісла" ў 1947 практычна ня мусілі нікога з Паўднёвага Падляшша вывозіць, бо там ня толькі што не было ніякага „ўкраінскага духу", але і не было ўжо выразнай ахвоты да захоўваньня ўласнай мовы, на якую ў міжчасе палякі начапілі зьняважлівую мянушку „хахлацкая". Суродзічы Міколы Янчука апынуліся ў такіх скразьняках гісторыі, што каб выжыць, яны мусілі пазбыцца апошніх прыкметаў няпольскага „этнічнага матэрыялу". Песьня Міколы Янчука згасла сярод ягоных землякоў ўсяго на працягу аднаго пакаленьня пасьля ягонай сьмерці.

А падляшукі на Беласточчыне выжылі якраз таму, што без праблемаў пакінулі ўніяцтва і перайшлі у праваслаўе. Дзякуючы таму, што нікому не супраціўляліся і нікога

ў сапраўднасьці не цікавілі (у тым ліку, дзеячоў украінскага нацыянальнага руху ў міжваеннай Польшчы), яны захавалі і свой этнічны патэнцыял, і мову, а потым яшчэ, у нейкім сапраўды капрызным зыгзагу гісторыі, набылі нацыянальную сьвядомасьць *sensu stricto*. Беларускую. Бо ж Падляшша і Беларусь — *jak dviê sestry rôdny*.

У малым коле яшчэ меншае кола

Украінскі рух сярод студэнтаў з нашага Падляшша ўзьнік недзе пад канец 1982 або на пачатку 1983. Галоўнымі завадатарамі гэтага руху былі мае калегі, якія год ці паўтара раней разам са мной з запалам арганізоўвалі БАС. Што ня менш цікава, гэтыя мае калегі наогул апынуліся ва ўнівэрсытэтах пасьля заканчэньня ліцэю № 2 у Бельску, дзе іх чатыры гады вучылі беларускай мове і, прынамсі ў тэорыі, прышчаплялі ім беларускі дух.

Можаце верыць або не, але крыху пазьней, паглядаючы на нараджэньне свайго руху з пэўнай гістарычнай рэтраспэктывы, украінскія дзеячы з Падляшша ўсур'ёз сьцьвярджалі, што рух нарадзіўся з чытаньня імі аднае ці дзьвюх кніжак, якія нібыта адплюшчылі вочы на тое, што яны насамрэч украінцы, а не беларусы. Бываюць жа такія магутныя кніжкі на сьвеце...

Адной з гэтых кніжак быў „Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny", першы том якога выйшаў у Варшаве ў 1980. Згаданы том клясыфікаваў усходнеславянскія гаворкі на Беласточчыне паміж рэчкамі Нарвай і Бугам на тры групы: пераходныя беларуска-ўкраінскія гаворкі, гаворкі з украінскімі рысамі, украінскія гаворкі. Гэтага нібыта хапіла, каб пасеяць зерне сумневу ў галовах некаторых падляшукоў, зь якога потым узрос украінскі рух. Ня ведаю, наколькі ўсяму гэтаму верыць, але сам добра помню, што „Atlas" служыў падляскім новаўкраінцам як важкі аргумэнт у іх прапагандысцкіх захадах. І далей служыць, бо мацнейшага аргумэнту за гэты яны так і не прыдумалі.

Ва ўплыў другой кніжкі на нараджэньне і разьвіцьцё ўкраінскага руху на Падляшшы значна цяжэй паверыць, чым ва ўплыў дыялектнага атлясу. А менавіта: мае калегі-новаўкраінцы сьцьвярджалі, што істотны імпульс для пошукаў сапраўднай нацыянальнай сьвядомасьці ім дала і кніжка Ўладзіміра Паўлючука „Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej", якая на пачатку 1970-х прарочыла капцы беларускай ідэнтычнасьці на Падляшшы ў пэрспэктыве аднаго-двух пакаленьняў. Ня выключана, што малады ўкраінскі рух мог чэрпаць пэўную маральную сілу з гэтага прароцтва. Аднак кніжка Паўлючука прарочыла капцы „праваслаўным" і „рускім" на Беласточчыне наогул — ня толькі беларусам, якія нейкім чынам сярод іх завяліся да выхаду кніжкі, але таксама і ўкраінцам ды іншым этнасам, якія да выхаду кніжкі зьявіцца не пасьпелі і якіх аўтар ніяк не прадбачыў...

Жарты жартамі, але калі гаварыць сур'ёзна, дык прыклад нашага нацыятварэньня паміж Бугам і Нарвай — гэта не мадэль XIX стагодзьдзя, калі мадэрныя нацыянальныя наратывы будаваліся на мітах „кроўнай сувязі" і „супольнага паходжаньня" ад нейкага першага цара Гароха або нейкага балотна-ляснога племені, якое пачало біць іншыя плямёны ў навакольных балотах і лясах ды нейкім чынам моцна іх пабіла, а то й зусім павыбівала... Нацыятварэньне на Беласточчыне ў выпадку беларусаў адбылося паводле постмадэрнай мадэлі, у якой нацыя — гэта, як выказаўся Бэнэдыкт Андэрсан, ня кроўная, а *ўяўленая* супольнасьць (*imagined community*). Высьвятленьне факту, ці падляшукі з-пад Бельску і Гайнаўкі мелі супольных продкаў зь ліцьвінамі з-пад Саколкі, ці з валынянамі з-пад Луцку, пераважную большасьць нашых беларусаў не цікавіла і наўрад ці калі зацікавіць. Найважнейшым чыньнікам у беларусізацыі праваслаўнага насельніцтва

Беласточчыны пасьля Другой сусьветнай вайны была супольнасьць гістарычнага лёсу праваслаўных ліцьвінаў і праваслаўных падляшукоў, якія, як праваслаўная меншасьць у каталіцкай дзяржаве, аднолькава адчувалі адчужанасьць ад быту і культуры каталіцкай большасьці, да якой належалі і беларускамоўныя католікі Сакольшчыны. Наша падляская беларускасьць пачалася ў кантэксьце праваслаўнай выспы ў каталіцкім моры і ў такім кантэксьце, хутчэй за ўсё, закончыцца. Падзел на „сваіх" і „чужых" для падляскіх беларусаў ляжыць у рэлігійнай плоскасьці, а ня ў моўнай. Таму беларускамоўныя католікі з-пад Саколкі — чужыя для беларускамоўных праваслаўных з Гарадка, а беларускамоўныя праваслаўныя з Гарадка — свае для падляскамоўных праваслаўных з Чыжоў або Орлі, і *vice versa*.

Украінскія дзеячы на Падляшшы ў якасьці асноўнага аргумэнту на карысьць украінскага нацыянальнага выбару выставілі дыялектную мапу, то бок, той самы міт родам з XIX стагодзьдзя пра нібыта супольнае этнічнае паходжаньне падляшукоў і валынян. Інакш кажучы, мы калісьці жылі на тым самым балоце, а толькі потым разбрыліся. Пераважная большасьць, якой гэты аргумэнт адрасуецца, звычайна яго праігнаравала.

Замест таго, каб прышчапіць іншую нацыятворную парадыгму праваслаўным падляшукам, дзеячы Саюзу ўкраінцаў Падляшша дамагліся толькі стварэньня невялічкага нацменшаснага гета ў большым нацменшасным геце. І дзяржаўных датацый на падтрыманьне квазі-жыцьця ў гэтым новым геце. Паводле перапісу 2002, у Падляскім ваяводзтве ўкраінцамі запісаліся каля 1500 чалавек; у той самы час беларусамі назвалі сябе больш за 46000 чалавек (паводле маёй ацэнкі, для 32 тысяч зь іх роднай (хатняй) мовай зьяўляецца падляская, для 8000 — беларуская, а для 6000 — польская). Дык вось, перапіс 2002 году — гэта якраз той постмадэрнісцкі нацыятворны адказ, які дало беларускае гета ўкраінскаму гету на Падляшшы.

Сэнс нацменшаснаму руху надае ня здольнасьць гэтай нацменшасьці афармляць дзяржаўную датацыю на розныя культурна-грамадзкія захады і фэстывалі ў нацменшасных строях, а здольнасьць выказаць апрычонасьць свайго лёсу ў сваёй мове і культуры, здольнасьць выказаць сваё слова, якога ня можа выказаць большасьць — ня толькі таму, што ў большасьці іншая мова, але і таму, што ў большасьці іншы лёс. Інакш кажучы, я бачу сэнс у існаваньні нашай беларускай меншасьці, толькі калі яна застанецца здольнай да крэатыўнасьці ў сваёй мове. Калі гэткая здольнасьць прападзе, які толк выдаваць беларусам на Падляшшы газэты і кніжкі па-польску? Палякі гэта робяць значна лепей і больш граматна за беларусаў.

З дэмаграфічных паказьнікаў вынікае вельмі ясна, што жывыя беларускія гаворкі на Беласточчыне ўжо амаль зьніклі. А з выдавецкай актыўнасьці ня менш ясна вынікае, што зьнікла ўжо і крэатыўнасьць на беларускай літаратурнай мове. Паколькі беларускай літаратурнай мовы не сілкуюць жывыя сокі народных гаворак, яна ў нас вяне і становіцца ўсё больш фармальнай і закасьцянелай. Сёньня самым маладым пісьменьнікам зь літаратурнага аб'яднаньня „Белавежа" ў Беластоку ня менш гадоў, чым мне — то бок, даўно мінула 50. Маладзейшых няма і ўжо ня будзе. На кожных 6 беларусаў прыпадае толькі адзін, які дома гаворыць на беларускай гаворцы (4 гавораць на падляскай гаворцы, а 1 — па-польску). Гэта занадта рэдкая атмасфэра і занадта нішчымная глеба, каб вырошчваць крэатыўныя для меншасьці адзінкі ў беларускай мове.

Але вось у гэтых засушлівых і неўрадлівых абставінах увесь час існуе амаль поўнасьцю незапатрабаваны і нявыкарыстаны крэатыўны патэнцыял, які тоіцца ў падляскай мове. Раней, калі падляскамоўныя беларусы яшчэ давалі рады пісаць прыстойныя вершы на

беларускай літаратурнай мове, гэтую незапатрабаванасьць і нявыкарыстанасьць можна было кваліфікаваць як марнатраўства. Цяпер, калі граматна і цікава пісаць па-беларуску на Падляшшы перасталі і ліцьвіны, і падляшукі, далейшае ігнараваньне падляскай мовы выглядае як падтрымліванае дзяржавай самагубства.

Нават частковы ці сымбалічны пераход беларускіх СМІ на Беласточчыне на падляскую мову мог бы аказаць дабратворны ўплыў на вызваленьне крэатыўнага патэнцыялу, які ў гэтай мове заключаецца.

Лёс у падляскіх беларусаў і падляскіх украінцаў па сутнасьці той самы. І мова па сутнасьці ў іх адна (калі мець на ўвазе мову, якой яны навучыліся ад мамы з татам, а ня ў школе). Але дзеячы аднаго і другога нацыятворнага руху прыкідваюцца, што іхнай роднай мовы не існуе. Самы яскравы і ганебны прыклад гэтага адрачэнства меў месца ў нядаўняй скандальнай справе ўсталяваньня дзьвюхмоўных дарожных знакаў у гміне Орля. Назвы вёсак у гміне Орля, як і мова яе жыхароў, падляскія, для прыкладу: *Вуорля/Vôrla*, *Вуолька/Vôlka*, *Кошэліэ/Košeliê*. Беларускія дзеячы не наважыліся ўвесьці літаратурныя назвы, каб не нарвацца на пратэст жыхароў. Усё ж, трэба пагадзіцца, існуе выразная розьніца паміж літаратурнай назвай *Маскаўцы* і мясцовай *Москувціэ/Moskuvciê*, або паміж *Градалі* і *Грэдэліэ/Hredeliê*. А таму абаронцы беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці схітравалі і пайшлі на „кампраміс”, у якім з аднаго боку здалі беларускае літаратурнае аканьне, а з другога праігнаравалі падляскія дыфтонгі *іэ* і *уо*. І цяпер маем на дарожных знаках у гміне Орля вось такія пэрліны беларускай граматнасьці як *Кошэлі*, *Москоўцы*, *Грэдэлі* або *Чахі Заболотны*. Украінскія дзеячы пратэставалі, маўляў, беларусы зьнявечваюць аўтэнтычныя „ўкраінскія” назвы вёсак, але і ім дыфтонгі сталі косткай у горле, і ўсё, на што ў іх хапіла сьмеласьці, дык гэта прапанаваць, каб замест *Орлі* напісаць *Вурля* (украінская літаратурная назва: *Вірля*). Як вам? Ці ж ня цырк на дроце за дзяржаўныя грошы?

Вельмі кароткая анталёгія падляскай паэзіі

З чаго бярэцца маё перакананьне, што ў падляскай мове тоіцца нейкі крэатыўны патэнцыял?

Перш за ўсё — з наяўных фактаў жыцьця, а ўжо потым — з маёй інтуіцыі і схільнасьці да прарочаньня.

Хоць беларусы на Беласточчыне наогул саромеліся і саромеюцца сваёй патаемнай падляскай мовы, то ўсё ж час ад часу публікавалі нешта на ёй, прычапляючы мове гэтых публікацый этыкетку „беларуская гаворка”.

Ну дык вось, на пачатак згаданы фрагмэнт паэмы „Čas, kotory vmiraje” Ірэны Баравік зь вёскі Мора (*Móre*), якому выпала стаць першым падляскім тэкстам, перакладзеным на ангельскую мову:

Viêtior jabłyka z jabłyń skidaje
Oj viêtior ty viêtior šalony
Diêd jabłyka na koliênach zbiraje
Stareńki zhorblany diêd

Diêdu de tvoja revolucija
Mołodosť jak iskry z-pud kôńskich kopyt

Tvoja mołodosť — koni biêhom čerez sviêt
Tvoja starosť — jabłyko zmorščane
I vsmiêška na hubach — jak by vsio viêdav

Ne płač małaja vnučka dorohaja ne płač
Płač ne pomohaje ludy odhaniaje
Ne pokazuj žalu i rozumna buď

Tvoja piêsnia šumit v sadkovi
Jabłyka jak krasny ščoki dyvčyniat
Štorôk smijutsia vesioło
Šče i javory spivajut i trava
Jak by vse taja same rosła
Hovorliva šelestliva vysoka

Kruhły slozy na tvojôj ruciê
Krov tvoja bižyt v mojôj krovliê
Bižat kruhom počatok z kunciom
Bižat kruhom

А цяпер мускулісты, хоць і даволі дэкляратыўна-рытарычны, верш Віктара Стахвюка з Трасьцянкі (*Trystiánka*), са зборніка „Bahrovy tiêń” (2002):

koli deń taki jak diś
što sypletsie vsio z ruk
što viêtior v očy
a mamona v pleču
i zimny pôt povze rosoju
za rozchrystany kovniêr
v zasochłum horli nic nema
kob plunuti na čornoho kota
a sercie dybitsie na sam vspomin
byłoho zła
zatrymajsie
prysiaď
vzhlani na sviêt
što byv uže do tebe
i ne znikne koli znikneš ty
pluń na strach
na vsio machni
v ditinstvo choč na mih verniś
raduhoju tam nakryj
svôj čornobiêły son
na reštu dion

Няблага, га? Ну дык яшчэ адзін, вельмі ўжо беларускі, пра тое, як мы хочам даць па пысе нашым мучыцелям, але наша памяркоўнасьць нам не дазваляе:

mniê zbrydło viêryti v raj
jaki čužynci čverat v našum sadi
a pameť prodkuv vdoptujut v nebyt

mniê zbrydło viêryti u čas
koli nadyde dovhoždana vola
j byti soboju vže ne bude vstyd

de ty choroša strôjna siniooka
de ty krasa moja
de ty duša moja
dovhoždana vola

vernusie mati do tebe
pered toboju stanu na koliêni
błahosławi mene na voli puť
mniê siłu dasť zemla moja pokutna
i ja okovy jich raju rozorvu

de ty choroša strôjna siniooka
de ty krasa moja
de ty duša moja
dovhoždana vola

І на заканчэньне некалькі вершаў Зосі Сачко зь вёскі Волька (*Vôlka*), найважнейшай на сёньняшні дзень паэткі падляскай мовы, якая жыве ў Бельску і спрабуе ў гэтым жыцьці не ўпусьціць тоненькую нітачку сэнсу. Вершы са зборнікаў „Nad dniom pochilana” (1991) і „Šče odna vesna” (1995):

* * *

z moho odinočestva — domu moho
ne vmiêju naveť napisati pišma
do bliźkich kotorych nema zo mnoju
i pomiž okružajuščych mene
jakoś tak nezamiêtno perejdu
narykajučy časami
na chvoroby brak hrošy
načalnikuv i susiêduv
— ne potišajte mene
ne zhodžuś prytvoratiś
budto ja ščasliva
chutčêj zajdu do tych
što ničoho ne zmiêtiat v očach

* * *

hovoru ob svobodi
a ne pryznajusia do sebe
lubju i zyču smerti
i tomu mojiê vorohi
dovho žyvut i zdorovy
a ja perestaju viêryti v Boha
vertajusia do pusteji kliêtki
a pryjateli vkidajut kôsť

kob hryzła
i łôkoť nanuč pud hołov

* * *

(...)
nema kuncia
kuplania toho što treba
i što robit tôlko zavał

ne siadeš
i ne skazeš : o-to dla sebe

ne ty znajdeš čas
a čas znajde tebe

i vže kruk letit
i vydziovbaje očy

* * *

Na nasiênie zemla žde
vinkam by cvisti v horôdciach
kôlko soku v starôj berozi
— napojit puv mertvoho seła
ptaški pryletiat
naładiat hniêzda
tiêni vsiadutsia na ławočkach
v samo południe
rozkinut karty

* * *

Vsio skazane
i znaješ jak žyti:
v spekotu vodu čerpajut
v syroje liêto vyhledajut soncia

idi prosto v deń
projdi nezamiêtno
chaj lepi piêsnia zvučyt
a muzykanta ne znajut

Чым падляская сытуацыя цікавая для РБ?

Час падвесьці вынікі.

Калі „ПрайдзіСьвет” запрапанаваў мне напісаць тэкст, у якім я глянуў бы на Беларусь „іншымі вачыма” — ці то вачыма замежніка і небеларуса, ці то, можа, вачыма беларуса, але добра-такі скасабочанага сваім падляскім сындромам — я пагадзіўся без ваганьня. І так я напішу тое, што сам схачу, а ня тое, аб чым мяне просяць, падумалася мне тады цынічна.

Але вось цяпер, убачыўшы, колькі я тут напісаў пра свае правінцыйныя комплексы, фактычна ні словам не згадаўшы комплексаў агульнанацыянальных і мэтрапольных, я вырашыў крыху паслухацца „ПрайдзіСьвету” і дапісаць старонкі паўтары вось такога чаканага „іншага погляду”. Хацелі — дык атрымлівайце.

Калі ў сакавіку 2008 мы з братам адкрылі старонку Svoja.org, каб распрыгоніць родную мову пераважнай большасьці беларусаў у Польшчы, мы дакладна разумелі, што вобраз Беласточчыны і беларускасьці на ёй, які мы пакажам, не спадабаецца беларусам у Менску. Няма шанцаў, каб яны палюбілі такое Падляшша. Але, думалі мы, магчыма, што пры нагодзе прэзэнтацыі гэтай нялюбай і пэрыфэрыйнай сястры Беларусі мы зможам растлумачыць некаторыя пытаньні агульнабеларускага значэньня.

Напрыклад, пытаньне стварэньня (заходне)палескай мовы і няслаўны канец гэтага праекту, сэнс якога, як здаецца, так і застаўся незразумелы для ўсіх тых, хто сустрэў гэтую ініцыятыву ў штыхі. Рэч у тым, што Палесьсе можна „зьбеларусізаваць”, то бок, уратаваць яго ад моўнай, культурнай і сьветапогляднай русыфікацыі, толькі даўшы яму шанец разьвівацца на базе сваёй мясцовай мовы і культурнай традыцыі. Нельга ўключыць Палесьсе ў беларускі культурны кантэкст, пабольшваючы колькасьць беларускамоўных школаў у Берасьцейскай вобласьці ці пасылаючы беларускамоўныя кніжкі ў тамтэйшыя бібліятэкі. Іх там ніхто ня будзе чытаць, і ніхто з палешукоў ня стане гаварыць па-беларуску па-за кабінэтам беларускай мовы. Так як ніхто ня стаў і ня стане гаварыць па-беларуску ў Бельску на вуліцы ці дома, нягледзячы на тое, што ўжо пяцьдзясят гадоў беларускай мове ў Бельску навучаюць па некалькі сотняў школьнікаў штогод. Тыя, што запісваюцца ў Бельску беларусамі, гавораць дома па-падляску, хоць ні ў якай школе іх гэтай мове не вучылі. Калі яны пачнуць забываць гэтую мову і гаварыць выключна па-польску, яны перастануць пісацца беларусамі. І ніякія ўрокі беларускай мовы гэтага не запыняць. З палешукамі падобная праблема. Жывая повязь зь беларускасьцю магчымая для іх толькі праз сваю хатнюю мову. Калі яе заступіць расейская мова, яны стануць *тоже белоруссамі*, то бок, у культурным сэнсе расейцамі, якіх поўна ва ўсёй астатняй Беларусі.

Або такое пытаньне. Існуе пераканаьне, што зьмена ўлады ў Беларусі на такую, якая была б больш спрыяльная беларусізацыі, радыкальным чынам палепшыць сытуацыю беларускай мовы як у дзяржаўнай камунікацыі, так і ў нацыянальнай культуры. Гэта мала праўдападобна. Калі мова перастае быць падтрымліваная самымі носьбітамі, ніякая дзяржаўная падтрымка ёй не дапаможа. Гэтак здарылася зь беларускай літаратурнай мовай на Падляшшы, дзе амаль зьвяліся жывыя носьбіты. І што з таго, што польская дзяржава ў змозе даць грошы на публікацыю нават дзесяці кніжак па-беларуску ў Беластоку, калі няма каму іх пісаць і няма каму іх чытаць? Перакладаючы гэтую сытуацыю на менскія рэаліі, скажу так: сытуацыя беларускай мовы палепшыцца радыкальным чынам толькі тады, калі Альгерд Бахарэвіч або Андрэй Хадановіч, здаўшы новую кніжку ў менскае выдавецтва, змогуць за аўтарскі ганарар і дывідэнды ад яе продажу пракарміць сям’ю прынамсі год часу. Так, як кормяць свае сем’і прыстойныя пісьменьнікі ў Польшчы або Ісьляндыі.

Або яшчэ вось гэта. Беларуская культура і беларускасьць як спосаб зарабіць на жыцьцё ня могуць быць закладнікамі дзяржаўнай палітыкі, бо такая сытуацыя вядзе да выраджэньня культуры і самой ідэі беларускасьці. Зноў жа Падляшша дае ці ня самы яскравы прыклад гэткага выраджэньня. Радыё Рацыя ў Беластоку — наглядны прыклад сытуацыі, у якой беларусы сталіся закладнікамі дзяржаўнай палітыкі. Замест таго, каб падтрымаць рэшткі жывой беларускасьці, якая аганізуе ў Чыжоўскай, Арлянскай ці Бельскай гмінах, беластоцкія журналісты змагаюцца за правы чалавека, дэмакратыю і свабодны доступ да

інфармацыі для грамадзян РБ. Я не кажу, што гэты занятак дрэнны для падляшукоў у прынцыпе. Але ў такой сытуацыі, у якой апынулася беларускасьць на Падляшшы, цяперашні асноўны занятак журналістаў Рацыі — гэта зьдзек са сваіх падляскіх бацькоў і дзядоў. Або — выгадны спосаб зарабіць на жыцьцё... Як у Польшчы, так і ў Беларусі мы ўжо такое калісьці праходзілі. У мінулым дзяржава плаціла за тое, каб беларуская літаратура змагалася за сацыялізм, камунізм і ўсё такое. І шмат нам засталося ад таго змаганьня? Ну, але прынамсі некаторым закладнікам няблага пажылося.

Ну вось, неяк так і закончым...